# ПРАЦЭДУРА АФАРМЛЕННЯ ЗЯМЕЛЬНЫХ ПАДАРАВАННЯЎ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ І ЯЕ ЗНАЧЭННЕ

***І. А. Доўнар**, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

З канца XV ст. развіццё феадальнага землеўладання ў ВКЛ ішло ў двух накірунках: па-першае, заканадаўча замацоўваецца ўлада вялікага князя на ўсёй тэрыторыі дзяржавы, хаця былыя князі-правіцелі асобных земляў-княстваў, якія ўвайшлі ў склад дзяржавы, прызначаючы ўладу вялікага князя, доўгі час лічылі сябе ўласнікамі гэтых зямель; і па-другое, паступова пашыраюцца правы феадалаў адносна ўсіх формаў землекарыстання. Як адзначаюць многія навукоўцы (М. Ф. Уладзімірскі-Буданаў, М. В. Доўнар-Запольскі, Т. І. Доўнар, Я. А. Юхо і інш.), дастаткова вялікі зямельны фонд, які знаходзіўся ў непасрэдным валоданні вялікага князя, быў галоўнай крыніцай даходаў вялікакняжацкага (а значыць, і дзяржаўнага) скарбу. Эксплуатацыя яго давала князю асноўныя сродкі як для пакрыцця дзяржаўных выдаткаў, так і на задавальненне патрэб гаспадарскага двара. Землеўладанні князя ўключалі ў сябе маёнткі, замкі, гарады, мястэчкі, сёлы, землі пад пашнямі, лясамі і г. д. Вялікакняжацкія (гаспадарскія) староствы і эканоміі размяшчаліся па ўсёй тэрыторыі ВКЛ і складаліся з вялікакняжацкіх двароў, фальваркаў і войтаўстваў, да якіх належала тая ці іншая колькасць вясковых паселішчаў.

Вялікі князь па просьбе феадалаў дараваў ім уласныя землі. Патрабаванне наконт звяртання землеўладальнікаў з адпаведнай просьбай у органы ўлады, якое пазней было афармлена нормамі Статутаў, было выклікана неабходнасцю дзяржаўнага кантралявання азначанага працэсу. Вялікакняжацкае падараванне («пожалование») феадалам зямлі ўяўляла сабою даволі складаны комплекс юрыдычных дзеянняў. Яно замацоўвалася спецыяльным гаспадарскім лістом, які выдаваўся з канцылярыі вялікага князя. Калі ж такі ліст адсутнічаў у землекарыстальніка, то гэта лічылася самавольным захопам і было падставай для адабрання зямлі. Абавязковым этапам у працэдуры падаравання зямлі была выдача спецыяльнай падаравальнай («пожалованной») граматы, таму што славеснае падараванне не мела юрыдычнай сілы. Заключным жа этапам падаравання было «увязанье», г. зн. увядзенне ў валоданне падараванай зямлёй, якое здзяйснялася праз асобную грамату мясцовай адміністрацыі. Дакладная форма «увязанья» невядома, аднак вучоныя мяркуюць, што працэдура гэта была аналагічная той, што практыкавалася ў больш познія часы. Можна меркаваць, што адпаведная грамата зачытвалася публічна перад насельніцтвам той мясцовасці, дзе размяшчалася падараваная нерухомасць, а затым разам з вопісам падараванага, які таксама абнародаваўся, перадавалася ўладальніку зямлі. Акрамя таго, акт «увязанья» рэгістраваўся ў кнігах «наместніцкага», г. зн. гродскага суда. Вялікі князь

па ўласным жаданні мог адабраць зямлю, прычым не толькі тую, якая знаходзілася ў пажыццёвым уладанні, але і нашчадным. Як сведчаць факты, маёмасць адбіралася не толькі за здзяйсненне дзяржаўных злачынстваў, але і за іншыя правапарушэнні, а часам – і без усялякай прычыны. Хоць паступова феадальныя землеўладанні ўсіх відаў (вотчынныя, выслужаныя, купленыя) робяцца недатыкальнымі і шляхта атрымлівае права распараджэння сваёй нерухомасцю, гэта не выключала неабходнасць пацвярджэння папярэдняга вялікакняжацкага «пожалования» зямель.

## А. ВАЛОВІЧ І Л. САПЕГА ЯК НОСЬБІТЫ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ XVI ст.

*Д. С. Жук, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

XVI ст. – Залаты Век Беларусі. Менавіта ў гэты час у Беларусі сфарміравалася плынь, прадстаўнікі якой спрабавалі вырашыць сацыяльна-палітычныя і прававыя праблемы праз свецкія тэорыі і ідэі, у аснову якіх былі пакладзены тэорыі натуральнага права і грамадскага дагавору. Аднымі з такіх прадстаўнікоў былі А. Валовіч і Л. Сапега. Яны грунтоўна акрэслілі важнасць і неабходнасць стварэння дзяржавы на аснове такіх катэгорый, як незалежнасць, суверэнітэт дзяржавы, свабода, роўнасць, справядлівасць і інш. А. Валовіч прымаў актыўны ўдзел у стварэнні Статута ВКЛ 1566 г. Яго погляды на дзяржаву, права паўплывалі на змест Статута 1566 г., у тэкст якога па прапанове А. Валовіча ўключаны артыкул, які забараняў «заграничникам», у першую чаргу феадалам Польшчы, набываць землі і займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ (Раздз. III, арт. 9). Ён з'яўляўся сапраўдным прыхільнікамі незалежнасці ВКЛ і актыўна праводзіў палітыку абароны яго дзяржаўнага суверэнітэту (Раздз. III, арт. 1). Вялікае значэнне А. Валовіч надаваў катэгорыі свабоды, лічачы, што кожны чалавек мае права ў поўнай ступені распараджацца ёю згодна са сваімі меркаваннямі. Ён таксама выступаў за свабоду веравызнання. Прафесар В. Ф. Шалькевіч адзначае, што подпіс А. Валовіча стаіць пад актам Варшаўскай канфедэрацыі, паводле якой прадстаўнікі ўсіх веравызнанняў павінны былі мець роўныя правы. Прагрэсіўная для свайго часу думка аб свабодзе веравызнання знайшла сваё адлюстраванне ў Статуце ВКЛ 1588 г. (Раздз. III, арт. 3). А. Валовіч выступаў супраць Люблінскай уніі і нягледзячы на яе заключэнне ў 1569 г., палажэнні аб дзяржаўным суверэнітэце ВКЛ не толькі перайшлі у Статут ВКЛ 1588 г., але і атрымалі ў ім больш шырокае распаўсюджванне ў параўнанні са Статутам ВКЛ 1566 г. (Статут ВКЛ 1588. Раздз. III, арт. 1, 4, 13).

З імем Л. Сапегі звязаны падрыхтоўка і выданне Статута ВКЛ 1588 г. Пры яго выданні Л. Сапега змясціў як прадмову да Статута «Прысвячэнне» Статута Жыгімонту III і «Зварот да ўсіх саслоўяў Вялі-